# Галоўнае – стварэнне вартых твораў

**Прадстауляем субяседніка**

*Уладзімір Гаўрыловіч нарадзіўся ў 1967 годзе на Жыткаўшчыне. Па адукацыі - настаўнік беларускай мовы і літаратуры, скончыў Мінскі педагагічны інстытут імя М. Горкага. Служыў ў войску. Выкладаў у роднай Вятчынскай сярэдняй школе, затым узначаліў калектыў Бялёўскай сярэдняй школы Жыткавіцкага раёна. Кіраваў школьным тэатрам. 3 1997 года - галоўны рэдактар газеты "Новае Палессе". Аўтар васьмі кніг прозы і публіцыстыкі. Лаўрэат многіх літаратурных конкурсаў. Празаічныя і публіцыстычныя творы друкаваліся ў шэрагу часопісаў і перыядычных выданняў Беларусі, Расіі. У снежні 2005 года ўзначаліў Гомельскае аддзяленне грамадскага аб'яднання "Саюз пісьменнікаў Беларусі".*

**— Уладзімір Мікалаевіч, новае грамадскае ао'яднанне пісьменнікаў узнікла ў Беларусі ў лістападзе мінулага года. Нагадайце, чым гэта выклікана?**

— Думаю, што самім жыццём. Перакананы, што стварэнне СПБ — заканамерны працэс. Многія пісьменнікі не пажадалі падтрымаць адкрыта аграрную ў дачыненні да палітыкі кіраўніка дзяржавы пазіцыю купкі палітыкаў ад літаратуры. Вось чаму і ўзноўлены — менавіта гэтае слова хочацца выкарыстаць туг — саюз аднадумцаў, які ўзначаліў вядомы пісьменнік Мікапай Чыргінец.

Узнаўленне новага Саюза пісьменнікаў Беларусі працягваёцца і зараз. Прычым новы саюз не створаны для нейкай барацьбы. Для нас галоўнае — літаратура. Нават больш — літаратура як аснова ўсёй культуры. Толькі яна можа аб'ядноўваць пісьменнікаў. Нешта другое — ужо не пісьменніцкая творчая арганізацыя. Гэта, нарэшце, зразумелі і тыя творцы, якія пакуль вагаліся — многія сталі на сённяшні дзень членамі новага грамадскага аб'яднання, бо пераканаліся: творчая арганізацыя пачала працаваць, і даволі плённа. Растуць яе рады: за няпоўных паўгода прынята ў і Саюз пісьменнікаў Беларусі восем нашых калег ла пяру, а ўсяго аддзялене налічвае зараз 25 прафесійных аўтараў. Канешне, мы не гонімся за колькасцю, гапоўны крытэрый — наяўнасць вартых у мастацкім плане твораў, кніг. Менавіта іх прадставілі пры ўступленні ў творчае аб'яднанне Міхась Кавалёў з Рагачова, Віктар Лоўгач з г. п. Акцябрскі, Аляксандр Алейнік з Гомеля, Юрый Арэстаў са Жлобіна, гамяльчанка Алена Агіна. Бясспрэчна, дададуць аўтарытэту нашай арганізацыі Та ленавіты празаік і драматург Васіль Ткачоў, празаік Валянціна Кадзетава са Жлобінскага раёна, паэтэса Ніна Шклярава, якія нядаўна выйшлі з Саюза оеларускіх пісьменнікаў і сталі нашымі паплечнікамі. Наш цяперашні клопат — каб у літаратуру Гомельшчыны ў бліжэйшыя гады ўліўся атрад здольных маладых пісьменнікаў з рэгіёнаў.

**— Чым жыве сёння абласное аддзяленне грамадскага аб’яднання “Саюз пісьменнікаў Беларуси?**

— На першым часе нам давялося вырашаць арганізацыйныя пытанні.

Клопатаў было нямала. І яны яшчэ буду ць. А літаратурнае жыццё, якому павінна спрыяць грамадскае аб’яднанне пісьменнікаў, зразумела, і не спынялася. Проста кожны з маіх калег па пяру нешта рабіў і да гэтага. Цяпер робім шмат разам.

Вясной мы распрацавалі. праграму мерапрыемстваў на год. І сёе-тое ўжо зрабілі. Для пачатку праведзена інфармацыйна-тлумачальная работа: наладзілі ў мясцовым друку шэраг публікацый пра арганізацыю. Пісьменнікам рэкамендавана часцей сустракацца з чытачамі ў школах, садках, бібліятэках, што яны і робяць. Напрыклад, хочацца згадаць творчую сустрэчу гомельскага пісьменніка А. Джада з ВІЧ-інфіцыраванымі хворымі ў Светлагорску. Мне асабіста спадабалася гамонка з загадчыкамі кіёскаў аблсаюздруку г. Гомеля, цікавасць людзей да ндшага аб’яднання. У чэрвені адбылася прэзентацыя кнігі старэйшага гомельскага паэта Юрыя Фатнева “Сны зямлі”, выдадзенай з дапамогай Гомельскага гарвыканкама. Юрый Сяргеевіч адзначыў сёлета 50-годдзе творчай дзейнасці. Яго ўрачыста ўшанавалі ў абласной бібліятэцы і калегі па творчаму саюзу, і чытачы.

Лічым важным наведаць многія раёны, завязаць сяброўства з супрацоўнікамі цэнтральных бібліятэчных сістэм, установамі адукацыі, мясцовымі літаратурнымі аб’яднаннямі. Зараз, дарэчы, рыхтуецца сумесны творчы семінар, удзельнікамі якога стануць пісьменнікі і журналісты вобласці. Тэма на сённяшні момант падаецца цікавай — асвятленне праблем меліярацыі Палесся, экалогіі. Будзем вызначаць ролю творчых саюзаў у гэтым накірунку, нашы агульныя стасункі. У плане — літаратурныя сустрэчы са школьнікамі, педагогамі.

Не выкажу нічога новага: разам — пісьменнікі і журналісты павінны захоўваць і зберагаць нацыянальную культуру, культуру свайго рэгіёна, не пазбаўляючы яе агульначалавечага зместу.

Сённяшні выпуск літаратурнага дадатку да “Гомельскай праўды” — цудоўны прыклад важкага партнёрства пісьменніцкай арганізацыі з газетай і абласной арганізацыяй Беларускага саюза журналістаў. Дзякуючы такой моцнай падтрымцы творы нашых пісьменнікаў-гамяльчан знойдуць свайго чытача хучэй.

**— Ці з’явіліся новыя публікацыі гомельскіх аўтараў у апошні час?**

— Так. Многія пісьменнікі і паэты стараюцца выкарыстаць шырокае поле друкаваных сродкаў масавай інфармацыі Беларусі. І не толькі. Актыўна працуем у накірунку адраджэння сувязяў з калегамі са славянскіх краін. І пэўныя вынікі тут ужо ёсць. У бягучым чэрвені спецыяльна да чарговага фестывалю моладзі “Славянскае адзінства” выйшаў нумар часопіса “Форум” (заснаваны

Міжнароднай асацыяцыяй фондаў міру, друкуецца ў Маскве, галоўны рэдактар, сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Расіі Уладзімір Мусаліцін). Там мы шырока прадставілі творчасць паэтаў і празаікаў Гомельшчыны. Часопіс атрымаўся даволі пазнавальным і знакавым для нашага аддзялення. Думаецца, што творчыя кантакты будуць развівацца больш плённа, чым у мінулыя гады, і не толькі з расіянамі. Ужо некалькі гадоў выходзіць міжнародны альманах “Славянские колокола”, які аб’ядноўвае творцаў Беларусі, Украіны і Расіі, дзе актыўна друкуюцца многія з нашых аўтараў. Будзем падтрымліваць творчыя кантакты, ажыццяўляць узаемаабмен творамі, друкавацца разам у розных выданнях. Гэта — на карысць усім нам, будзе спрыяць дружбе славянскіх народаў.

Але не толькі публікацыі маюць сёлета нашы аўтары. Выходзяць і кнігі. Напрыклад, новы зборнік гумару і сатыры “Ход канём” пісьменніка з Рагачова, лаўрэата прэміі часопіса “Вожык” Міхася Кавалёва.

Зараз мы актыўна рыхтуем першы альманах аб’яднання, які, спадзяёмся, выйдзе ў першай палове наступнага года пры падтрымцы абласнога выканаўчага камітэта. Ёсць і іншыя задумкі, якія, спадзяюся, ажыццявяцца. І першая — абласны літаратурны конкурс імя Кірылы Тураўскага, заснавальнікамі якога выступяць два абласныя творчыя саюзы, мясцовыя органы ўлады, спецыялізаваная Славянская бібліятэка.

**— Тое, што вы жывяце ў Жыткавічах, не перашкодзіць ажыццяўленню планаў?**

— Зусім не. Сапраўднаму пісьменніку “нянька” не патрэбна. Галоўнае ж для яго — стварэнне вартых твораў. Задача старшыні найперш бачыцца ў тым, каб дапамагчы пісьменніку ў публікацыі твора, выданні кнігі, калі ён звяртаецца за такой дапамогай. Саюз будзе шукаць сродкі, каб тэта рабіць. Спадзяёмся на падтрымку мясцовых органаў улады.

Ды і па службовых справах як галоўны рэдактар раённай газеты я часта бываю ў абласным цэнтры, І нішто не перашкаджае сустрэцца з калегамі, падтрымаць належнага аўтара, арганізаваць нейкую справу. Галоунае тут — ствараць дух творчасці. Ды і памочнікі ў мяне ёсць, члены савета аддзялення, яны, дарэчы, усе жывуць у абласным цэнтры.

**— Ці былі выпадкі адмовы ў прыёме у творчы саюз?**

— Былі і будуць, таму што творы павінны быць сапраўднымі, адпавядаць жанравым патрабаванням і пэўнаму мастацкаму узроўню. Іх рэцэнзуюць вопытныя аутары. Раз на квартал цяпер мы практыкуем разгляд творчасці кандыдатаў на рабочым пасяджэнні савета аддзялення. Да твораў трэба прыкласці заяву, рэкамендацыі членаў саюза, кнігі, публікацыі, аўтабіяграфію і творчую даведку. Беспадстаўна мы нікому не адмовілі ў разглядзе ці прыёме дакументаў.

— **Што вас, як старшыню творчай арганізацыі, зараз найбольш хвалюе?**

— Найперш тое, што звалілася цэлая лавіна рукапісаў, якія з ўсёй Гомельшчыны прывозяць, дасылаюць для рэцэнзавання. Гэта забірае шмат часу, а яго ж, самі разумееце, бракуе.

Хвалюе тое, што многія з пісьменнікаў шэсць-сем гадоў таму паздавалі рукапісы ў дзяржаўныя выдавецтвы і дагэтуль не атрымалі ніякай надзеі на выданне кніг. Імкнемся пэўным чынам падзейнічаць на гэты працэс.

На жаль, у апошні час многія аўтары вымушаны самі стаць менеджерамі. Хвалюе і такая нярадасная сітуацыя: дзяржава штогод выдзяляе сродкі для набыцця літаратуры бібліятэкамі. Аднак ці многа ў нас на Гомельшчыне ў бібліятэках кніг мясцовых аўтараў? Канешне, павінны быць там кнігі, а іх часам няма. У той жа час выходзяць вартыя творы нават на тэрыторыі вобласці, але цікавасці да іх — нуль. Хадзі, аўтар, кланяйся, можа, хто і зжаліцца, нават калі ты ёсць у планах выдавецтва. Але цябе не бачаць!

— **Пісьменніцкая прафесія рэліктавая. Кожны аўтар — нібы асобная планета са сваім светапоглядам. Ва ўсе часы літаратурная “брація” як бы супрацьстаўляла сваё “я” уладам, ды і між сабой нярэдка бывалі нелады...**

— Розныя думкі, што датычыцца літаратуры — рэч зразумелая, калі пра адзін і той жа твор выказваюцца абсалютна процілеглыя ацэнкі. Пабольш бы такіх дыскусій!

З другога боку, мы павінны разумець такую рэч: ідэалогія дзяржавы без літаратуры немагчыма. Не было б суверэннай Беларусі без твораў Купалы, Коласа, Багдановіча, Караткевіча, Мележа, Макаёнка, Шамякіна.

Яны — духоўныя стваральнікі дзяржавы. Мы ж, іх прадаўжальнікі, аб’яднаўшыся ў саюз аднадумцаў, павінны прапагандаваць сваю краіну, пісаць пра яе людзей, праслаўляць усё лепшае, і, канешне, па-мастакоуску ўскрываць “нарывы”. Гэта наш абавязак. А дзяржава ў сваю чаргу павінна тут дапамагаць. Галоўнае, каб кожны займаўся сваім: палітык — палітыкай, а літаратар — літаратурай. І не было наадварот. Тады будзе карысць, тады з’явяцца годныя нашай зямлі творы, якімі будуць зачытвацца.

— **Сёлета вы наведвалі Швейцарыю. З якой мэтай?**

— Па прапанове Беларускага фонду культуры і Дэпартамента адукацыі і культуры швейцарскага кантонаАаргау ў красавіку на працягу двух тыдняў я знаёміўся з культурам, народнымі традыцыямі, фальклорам гэтай краіны. Адначасова гэтым самым займаўся на Жыткаўшчыне швейцарскі пісьменнік. Нашы ўражанні пакладзены ў аснову кнігі аб гасціннасці двух народаў. Выданне

на дзвюх мовах — беларускай і нямецкай, багата ілюстраванае — хутка выйдзе ў Швейцарыі. Затым будуць прэзентацыі ў дзвюх краінах.

**— Якой бы вы хацелі бачыць літаратурную Гомельшчыну ў бліжэйшай перспектыве?**

— Калейдаскоп накірункаў і стылёвых пошукаў. Новыя творы. Новыя імёны. Новае пакаленне маладых творцаў. Талент і яшчэ раз талент. Хацелаея б, каб з-пад пяра нашых аўтараў рэалізаваліся паэтычныя і празаічныя задумы ўзроўню Мележа, Шамякіна, Макаёнка...

**— Поспехаў вам, Уладзімір Мікалаевіч, вашым калегам на творчай ніве.**

— Дзякуй. Спадзяюся, што наша У журналісцка-пісьменніцкае адзінства на карысць роднай Гомельшчыны І будзе мацавацца.

Гутарку вяла Т. КУПРЭВІЧ